№ 1 (12) Субота, 16 лютага 1929 г., м. Вільня. Год III.

БЕЛАРУСКІ РАДНЫ

ПЭРЫЯДЫЧНАЯ ЧАСОПІСЬ ПА САМАЎРАДАВЫМ СПРАВАМ НАШАГА КРАЮ

Рэдакцыя і Адміністрацыя: WILNO, Zawalna 5—6. Тэлефон 14—35.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА.
За 3 месяцы. . . . 2 зл.
І нумар . . . . 50 гр.

АБВЕСТКІ ПА УМОВЕ

Роля Самаўрадау у нашым Краю.

Паўтарагадовы пэрыёд істнаваньня нававыбранага самаўраду дае поўную магчымасьць аценіць ягоную ролю ў гаспадарчым жыцьці нашага краю.

З тае пары, як пасьля маёвага перавароту польскі Сойм амаль што зусім утраціў сваё значэньне, як народнае прадстаўніцтва, самаўрады зьяўляюцца адзіным выбарным органам, які з пасьпехам можа бараніць прынамся гаспадарчыя інтарэсы сваіх выбаршчыкаў. Значэньне самаўрадаў нашага краю з пераважаючаю большасьцю беларускага насяленьня павялічваецца яшчэ тым, што беларускія палітычныя партыі па розным прычынам заміраюць і трацяць свой уплыў на беларускае грамадзянства. Дзеля гэтага добра яшчэ здарылася тое, што беларускія радныя стаялі ў старане ад палітыкі, дзякуючы чаму пераж ываемы крызыс беларускімі палітычнымі чыньнікамі не крануўся іх. У гэтым ёсьць пэўная заслуга і „Беларускага Раднага“, які з самага пачатку свайго істнаваньня рашуча стаў на грунце абароны самаўраду ад умяшацельства яго ў палітыку.

Але ні для жыдоў, ні для украінцаў, ні для немцаў самаўрад ня мае гэткага значэньня, як для нас, беларусаў. Усе гэтыя нацыянальнасьці, як больш арганізаваныя, могуць бараніць свае нацыянальна-культурныя і гаспадарчыя інтарэсы і па-за межамі Сойму і Самаўраду. Як лепшы доказ таго, што з гэтымі нацыянальнасьцямі больш лічацца, зьяўляюцца тыя значныя дзяржаўныя і камунальныя дапамогі, якія выдаюцца на іх школы і розныя арганізацыі. Напрыклад, для украінскіх дабрачынных арганізацыяў Сойм ухваліў у бюджэце на наступны год больш 180,000 зл. А якія значныя сумы атрымліваюць жыды з розных крыніцаў на свае школы, шпіталі, прытулкі для бедных, старых і дзяцей і г. д. Праўда, гэтыя нацыянальнасьці ўмеюць лепш бараніць свае інтарэсы, чым беларусы.

Для нас-жа Самаўрады зьяўляюцца адзіным легальным органам, які можа і мае права бараніць інтарэсы сваіх выбаршчыкаў. Нажаль, ня ўсімі беларусамі ў свой час было належна аценена значэньне Самаўраду, і дзеля гэтага беларускае грамадзянства выступіла на выбары да самаўрадаў без адпаведнае падрыхтоўкі і арганізацыі. З усіх беларускіх арганізацыяў адзін толькі Беларускі Нацыянальны Выбарны Камітэт своячасна папярэдзіў беларускіх выбаршчыкаў па Віленшчыне і Наваградчыне аб выбарах сваімі адозвамі і інструкцыямі, у той, час, як іншыя „палітыкі“ на'т перашкаджалі яму у гэтай, здавалася-б, нешкадлівай для беларускага народу працы.

Дзякуючы гэтым-жа перашкодам, не ўдалося паставіць беларускіх радных на больш рэальны грунт працы і пасьля выбараў. На беларускі Самаўрадавы зьезд, які адбыўся ў Вільні у восені 1927 г., хаця і зьехалася значная частка беларускіх радных, аднак-жа дзякуючы выразнаму палітычнаму абліччу арганізатара зьезду з аднаго боку і перашкодам з боку „палітыкаў“ іншых кірункаў з другога,—зьезд гэты не дасягнуў свае мэты. Выбраны ім Беларускі Камітэт па Справам Самаўрадаў, які павінен быў стаць цэнтральным кіруючым органам для беларускіх радных, не здабыў належнае павагі і аўтарытэту сярод беларускага грамадзянства і беларускіх радных і ня выявіў сябе аніводным рэальным чынам.

Гэткім чынам, першая спроба прыдаць

арганізаваны характар працы беларускіх радных не удалася. І гэная неарганізаванасьць беларускіх радных ад'емна адбіваецца на ўсіх галінах гміннага жыцьця. Толькі дзякуючы неарганізаванасьці і неразуменьню беларускімі раднымі свайго значэньня і абавязкаў перад выбаршчыкамі, можна вытлумачыць гэткія зьявішчы, як асыгнаваньні гміннымі радамі з беларускаю большасьцю субсыдыяў на польскія выдавецтвы, школы, бібліятэкі, розныя арганізацыі з выразным палітычным характарам, на абарону „польскасьці" на Заходніх Крэсах і на'т заграніцаю (Сіняўская гміна), — у той час, як уласныя беларускія выдавецтвы, школы, культурна-асьветныя і дабрадзейныя арганізацыі пазбаўлены гэнае грашовае дапамогі.

Украінцы, напрыклад, маюць каля 100 пэрыёдычных часопісаў, з якіх больш паловы выключна гаспадарчага зьместу. А у нас засталося толькі каля 5, ды і тыя, здаецца, хутка спыняцца зусім. Што зачыняюцца беларускія палітычныя газэты, па незалежным ад сябе прычынам, ад гэтага яшчэ не вялікая бяда. Прынамся, менш чуваць узаемнае лаянкі, кампрамітуючай беларусаў. Але беларускія радныя маглі-б, здаецца, ахвяраваць хоць нязначныя сродкі на незалежны самаўрадавы беларускі орган, які служыў-бы вольнаю трыбунаю для іх.

Калі да гэнае пары яшчэ выходзіць „Беларускі Радны", вольны ад уплыву з боку якіх-небудзь палітычна-партыйных чыньнікаў, дык у гэтым няма ніякае заслугі беларускіх радных, якія к свайму сораму, не усьведамляюць сабе вялікага значэньня самаўраду у сучасны палітычны момант пры агульнай неарганізаванасьці і культурна-гаспадарчым заняпадзе беларускага народу.

З часам можа і зразумеюць гэта, але можа быць позна. А прамядленьне часу беспаваротнай сьмерці падобна.

Стан пажарніцтва у Віленскім Ваяводзтве

У „Беларускім Радным" (N 6) мы ўжо зьярталі ўвагу на тую вялізарную небясьпеку, якую прадстаўляюць пажары у нашым „саламяным" краю і на тыя сродкі, якімі грамадзянства на чале з самаўрадамі павінна вясьці барацьбу з гэтаю небясьпекаю. На гэты раз мы паінфармуем сваіх чытачоў з фактычным станам пажарніцтва ў Віленскім ваяводзтве ў параўнаньні з іншымі ваяводзтвамі.

Паводле даных з гадавога адчоту за 1928 г. аб стане пажарніцтва у Віленскім ваяводзтве, зьмешчанага ў „Пжэглёндзе Пожарнічым" (N 1 i 2) за 1929 г. і беспасрэдніх інфармацьяў, атрыманых ад інспэктара Ваяводзкага Саюзу Пажарных пана П. Дальстэдта (Вільня, Завальная 6—5), стан пажарніцтва у Віленскім ваяводзтве прадстаўляецца ў наступным відзе.

Абшар Віленскага ваяводзтва складае 28,409 кв. кілямэтраў. У пажарным адношаньні найбольш небясьпечны, — бо большасьць вясковых будынкаў з саламянымі стрэхамі.

У пэрыёд часу 1920 — 1923 г. удалося арганізаваць 34 пажарныя стражы і стварыць Саюз. Гэткім чынам адна стража прыходзілася ў сярэднім на 836 кв. кіл. Ад гэтага часу арганізацыйная праца ў галіне пажарніцтва паволі парушалася уперад, дзякуючы сталым стыхійным пажарам, так што ў 1925 годзе ужо прыходзілася адна стража на 568 кв. кіл., 1926 г. — 400 кв. кіл., 1927 г. — 305 і 1928 г. — 184 кв. к.

У 1927 г. адна стража прыходзілася у крэсавых ваяводзтвах: Палескім — на 497 кв. кіл., Віленскім—305, Валынскім—229, Беластоцкім—251 і Навагрудзкім—253 кв. кіл. У цэнтральных ваяводзтвах: Любэльскім — 60 кв. кіл., Станіслаўскім—53, Келецкім — 39, Варшаўскім — 42, Тарнапольскім — 29, Львоўскім—27, Лодзінскім—25, Кракаўскім—26. Гэткім чынам, у 5 крэсавых ваяводзтвах на агульны абшар 156,664 кв. кіл., прыходзілася ў 1927 г. 367 стражаў, ці адна на 295 кіл. у сярэднім. У 8 цэнтральных ваяводзтвах — 4489 стражаў на абшар 184,360 кв. кіл., ці адна на 36 кв. кіл. у сярэднім.

У якім тэмпе разьвіваецца пажарніцтва ў Віленскім ваяводзтве, відаць з наступнага: у 1926 г. была 71 стража, а у канцы 1928 г. — 154. У паасобных паветах ваяводзтва лічбавы стан пажарных стражаў у 1926, 1927 і 1928 г. быў наступны: Віленска-Троцкі павет — 17 — 22 — 32 стражы, Сьвянцянскі — 14—19—25, Дзісьненскі—9—11—22, Вялейскі—6—11—21, Браслаўскі—5—7—18, Ашмянскі—7—10—13, Маладэчанскі—8—8—12 і Пастаўскі—5—5—11. Разам: 71—93—154.

З пункту гледжаньня матэр'яльнага абарудаваньня гэтыя 154 стражы выглядаюць так: насосаў — 255, бочак — 554, гідранэтак—3, гідразюраў—9, драбінаў Шчэрбоўскага—14, рэквізаваных вазоў—46, багроў — 870, вёдзер—407, кішкі—4,223 мэтры касак—1009, шапак 1701, рэмізаў—41 і розныя дробныя снасьці.

Усіх гэтых рэчаў яшчэ значна не хапае да нармальнага укамплектаваньня кожнае стражы. Калі аблічыць вартасьць поўнага абарудаваньня аднае дабрахотнае стражы паводле цэнніку аднае з варшаўскіх фірмаў у 8,366 зл., дык на пакупку нехапаючых снасьцяў патрэбавалася-бы для 154 стражаў—713,953 зл. А на 414 стражаў, якіх прыблізна яшчэ не хапае на Віленскве ваяводзтва, патрэбна было-б каля 3 міл. зл.,

прыймаючы пад увагу толькі самыя неабходныя рэчы.

На кошт соймікаў у канцы 1927 г. былі арганізаваны 8-дзённыя пажарныя курсы, якія скончыла 375 асобаў з наступных паветаў: Віленска-Троцкага — 122 асобы, Сьвянцянскага—72, Дзісьненскага—23, Вялейскага і Маладэчанскага — 17, Браслаўскага — 51, Ашмянскага — 27 і Пастаўскага—37. У 1929 годзе Віленскі саюз мае на мэце яшчэ арганізаваць 8-дзённыя курсы для тэорэтычнае і практычнае падгатоўкі пажарных.

Для пасьпешнага разьвіцьця пажарніцтва мала яшчэ аднае сьведамасьці патрэбы яго і маральнага падтрыманьня з боку грамадзянства. Патрэбны яшчэ значныя матэрыяльныя сродкі, якіх трудна чакаць ад дзяржавы. У нас пажарныя стражы утрымліваюцца, як ведама, на сродкі П. З. У. В. (Польскі Саюз Узаемнага Страхаваньня) і Самаўрадаў. Некаторыя выражаюць пагляд, што пажарніцтва павінна цалком утрымлівацца на сродкі П.З.У.В. Але гэты пагляд неправідловы, дзеля таго, што страхоўцы не падлягае жывы і рухомы інвэнтар, які гэтак сама як і нярухомасьці, падае ахвяраю пажараў. Дзеля гэтага цяжар выдаткаў на пажарніцтва трэба ўзлажыць на усё грамадзянства.

На падставе даных П.З.У.В. гэта інстытуцыя выдала на падтрыманьне пажарніцтва у цэлай Польшчы у 1926 г. для 1657 стражаў — 600,538 зл., 1927 г. для 2517 стражаў — 1,028,773 зл., і за першую палову 1928 г.—510,000 зл.

На тэрэне Віленскага ваяводзтва у гэты час выдана: 1924 г. — 5,421 зл., 1925 г. — 26,894 зл., 1926 г.—44,204 зл., 1907 г.—22,929 зл. і за 9 месяцаў 1928 г.—21,552 зл.

Удзел павятовых самаўрадаў у падтрыманьні пажарніцтва у Віленскім ваяводзтве уяўляецца ў наступных лічбах: Соймікі вызначылі у бюджэце на 1928—29 г. на Саюз 4,700 зл. і на стражы—9,367 зл., але фактычна выдалі Саюзу толькі 1,900 зл.

У параўнаньні з цэнтральнымі ваяводзтвамі гэта дапамога самаўрадаў зводзіцца амаль на 0. Напр., у Келецкім ваяводзтве павятовыя Соймікі выдаткавалі на пажарніцтва ў 1927 г. — 344,612 зл. і П. У. З. В. — 206,029 зл.

Цяпер на ўсё Віленскае ваяводзтва ёсьць адзін інспэктар і адзін інструктар, які знаходзіцца пры цэнтралі Саюзу. А для лепшае падрыхтоўкі пажарніцтва трэба было-б мець аднаго інструктара на два паветы, хаця Саюз імкнецца да таго, каб мець аднаго інструктара на кожны павет.

Для ілюстрацыі прывядзём некалькі даных з разьвіцьця пажарніцтва у Вільні. Да 1925 г. у Вільні былі толькі конныя бочкі і насосы. Цяпер места мае 7 самаходаў, з якіх адзін воз скорае помачы з насосам. 3 аўтанасосы і тры аўтабочкі. На 1929 г: прадбачана бюджэтам павялічэньне яшчэ на 3 аўтавазы — 1 мэханічную драбіну і дзьве бочкі. Вартасьць усяго інвэнтару складае больш 138,000 зл. У меставым бюджэце на пажарніцтва асыгнавалася: у 1926 гі — 260 тыс. зл., 1927 г. — 330 т. зл., 1928 г. — 380 тыс. зл. і 1929 г.—400. т. зл.

Дык, як бачым з гэтага кароткага агляду, стан пажарніцтва у Віленскім ваяводзтве стаіць на вельмі нізкай ступені і патрабуе яшчэ вялікіх высілкаў як з боку грамадзянства, гэтак і самаўрадаў, для падняцьця на належную вышыню, адпавядаючую свайму назначэньню.

Самаўрадавая хроніка.

СІНЯЎСКАЯ ГМІНА.

Віленская польская газэта „Слово“ (нумар 27) зьмяшчае вельмі цікавую карэспандэнцыю з Сіняўскае гміны.

„Цікавы і вельмі прыемны маем факт для адцяненьня—піша газэта. „Т-во Оброны Крэсув Заходніх“ зьвярнулася да павятовых і гмінных самаўрадаў з просьбаю аб грашовым падтрыманьні акцыі, зьвязанай з абаронай польскасьці у заходніх дзяльніцах нашае дзяржавы перад нямецкім націскам, роўным чынам для барацьбы з анямечаньнем сярод палякаў, якія жывуць у Нямеччыне.

Амаль ня ўсе гмінныя самаўрады прынялі да ведама адозву і схавалі пад сукно. Выняткам зьяўляецца толькі Сіняўская гміна.—Ласьне, там гмінная рада на прапазыку войта Антона Мелашкевіча і сэкрэтара Ігната Родкевіча у дню 12. I ухваліла ахвяраваць з бюджэтных рэштак ад 1928—29 г. г. 100 зл. для Т-ва Абароны Зах. Крэсаў, вызначыўшы 50 зл. на абарону польскасьці Зах. Крэсаў, а другія 50 зл. на культурную дапамогу для палякаў, пражываючых на даўняй тэрыторыі польскай, якая цяпер, нажаль, належыць да Нямеччыны.

Ухвала Сіняўскае Гміннае Рады заслугоўвае ня толькі на выражэньне поўнага прызнаньня, але і на увагу. Ёсьць яна тым характэрыстычнай, што на 15 асобаў, уваходзячых да складу Рады, ёсьць толькі 1 паляк, 1 жыд і 13 беларусаў...“

Гэта называецца быць большым каталіком, чым рымскі папеж.

Калі жыды маюць свайго Бэрку Ёселевіча, дык беларусы маюць Сіняўскую Гмінную Раду, якая уцерла нос польскім гмінным Радам у ахвярнасьці на абарону „польскасьці“ ня толькі на Заходніх Крэсах, але на‘т і за граніцаю.

Мусіць, ляўры Бэркі Ёселевіча не даюць спаць беларускаму войту Сіняўскае гміны Антону Мелашкевічу.

У адным з наступных нумароў „Слова" (N 34) у карэспандэнцыі пад загалоўкам „Ці варта цешыцца?", карэспандэнт адносна гэтае ухвалы Сіняўскае гміны між іншым піша:

„Ляпей-бы пан войт зрабіў, калі-б не налягаў на радных, каб галасавалі, як быццам іх вельмі абходзіць польскасьць на заходняй граніцы ці за граніцаю. Гэткая містыфікацыя, уводзячая людзей у абмылку, зусім не пажаданая".

Вось дык дачакаўся! Стараўся, стараўся пан войт і перастараўся. Заместа падзякі, на'т палякі! адносяцца да яго чыну „з падазрэньнем".

БЮДЖЭТ ВІЛЕНСКА-ТРОЦКАГА КАМУНАЛЬНАГА САЮЗУ НА 1929—30 ГОД.

Бюджэт Віленска-Троцкага павятовага камунальнага саюзу на 1929—30 г. уложаны у наступным відзе:

Звычайныя выдаткі дасягаюць агулам—704,565 зл., з іх: 1) на агульную адміністрацыю—9,997 зл., 2) на утрыманьне соймікавага дому—5,812 зл., 3) на выплату даўгоў—25,000, 4) на дарогі і публічныя пляцы — 264,075 зл., 5) на асьвету—7,700 зл., на субсыдыі для культурна-асьветных арганізацыяў — 1,400 зл., 7) на публічнае здароўе — 44,900, 8) на падтрыманьне земляробства — 122,927, 9) на падтрыманьне прамысловасьці і гандлю—6,530 зл., 10) на публічную бясьпеку — 21,237 зл. і 11) на розныя выдаткі—11,850 зл.

Выдаткі надзвычайныя складаюць 388,000 зл., з іх: а) на будову шошы Панары—Ляндвароў—275,000 і б) на будову псыхіатрычнага шпіталю ў Койранах—24,000 зл.

Звычайныя даходы складаюцца з наступных аддзелаў: 1) камунальнае маемасьці — 18,945 зл., 2) камунальных прадпрыемстваў—5,533 зл., 3) субсыдыі—17.732 зл., 4) звароты—28,683 зл., 5) адміністрацыйныя аплаты—900 зл., 6) аплата за карыстаньне публічнаю маемасьцю—59,975 зл., 7) удзел у дзяржаўных падатках—27 000, 8) дадаткі да дзяржаўных падаткаў—256,883, 9) падаткі—285,961.

Даходы надзвычайныя складаюць — 338,000 зл., з якіх—1) субсыдыя Міністэрства публічнае працы на будовы шошы Панары-Ландварова—225,000 зл., 2) рэшта бюджэтнага крэдыту на 1928—29 г. — 50,000 зл., 3) і рэштка (надвышка) бюджэту з 1928—29 г.—58,000 зл.

— *З Дзісьненскага Сойміку.* У мінулым месяцы некалькі дзён засядала камісія пад старшынствам Дзісьненскага Старасты п. М. Янкоўскага над ўкладам бюджэту на 1929—30 год. Камісія складалася з фаховых сілаў і апрача бюджэту разглядзела яшчэ шмат справаў, як напрыклад: мэліорацыі, дапамогі пацяпершым ад неўраджаю, у зьвязку з чым прынята рад ухвалаў, датычачых забясьпячэньня жыхароў ад голаду, ахова земляробскіх гаспадарак ад упадку, дапамогі сеўнай, гваранцыі крэдытаў і іншае. А каб ўсё гэта лягчэй правясьці у жыцьцё, 17 студня адбыўся зьезд войтаў і бурмістраў.

— *Са Сьвянцянскага Сойміку.* 25 студня Павятовы аддзел укадаў бюджэт Сьвянцянскага Сойміку на 1929—30 год, які у палове бяг. месяца будзе аддадзены на разгляд Сойміку.

— *Недагляд ў Гарадоцкім Гмінным Урадзе, Маладэчанскага павету.* Як пішуць польскія газэты, аднаго дня мінуўшага месяца заўважана было раніцай, што каса Гміннага Ураду была адчыненай. Спраўдзіўшы грошы аказалася, што не хапае 1635 злотых. Дзеля таго, што ніякіх ушкаджэньняў не сканстатавана, прыпушчаюць, што каса ня была зачынена на ноч.

Злодзей, відаць, быў чымсь спалоханы і не пасьпеў забраць быўшых у касе — 15 руб. залатых і 117 зл. ў білёне.

Недахоп грошы пакрыў войт гміны Б. Ігнатовіч. Паліцыя вядзе сьледзтва.

— *Паседжаньне ваяводскае рады ў Навагрудку.* На 18 лютага вызначана паседжаньне Наваградзкае ваяводзкае рады, у склад якой уваходзяць: пас. Таўропіньскі (соймік Барановіцкі), Юшкевіч (с. Слонімскі), Мальскі (с. Лідзкі), Госкоўскі (с. Стаўпецкі), Яленскі (с. Нясьвіскі), Волчацкі (с. Валожынскі). Гэта будзе першае паседжаньне рады і будзе мець арганізацыйны характар.

— *Пажычка на мэліорацыю.* Наваградзкі соймік атрымаў 18,000 зл. на мэліорацыю грунтаў ральнічае школы у Кушэлеве.

— *Увазе войтаў.* У зьвязку з апошнімі сьнежнымі заносамі некаторыя войты атрымалі загад зьвярнуць асаблівую увагу на стан дарогаў, якія павінны быць упарадкаваны, каб ня было ніякіх перашкод для пешага і коннага руху.

— *З Радашкавіч.* Ёсць прыказка: „сем разоў прымерай, а раз адрэж". Але, нажаль, ня ўсе гэнае прыказкі трымаюцца. Радашкоўскі магістрат распачаў будову вялікага гмаху, у якім павінны былі месьціцца магістрацкая канцэлярыя, саля меставая, рэміза пажарнае стражы і г. д. Але не падумаў аб галоўным—грошах. Як толькі распачалася будоўля, не хапіла грошаў. Магістрат зьвярнуўся да Банку Гаспад. Краёвай з просьбаю аб пазычцы. Але той адмовіў. Цяпер магістрат ломіць галаву над тым, як-бы абараніць выбудаваную частку гмаху ад развалу.

Пры гэтым цікава тое, што у раёне Радашкавіч няма ніводнае цагельні, хаця ёсьць і гліна і адпаведныя мейсцы. 1000 штук цэглы каштуе 160 зл. У месьце адчуваецца вялікая патрэба цэглы. А магістрат, заместа таго, каб задавольніць гэную жыцьцёвую патрэбу, распачынае вялізарныя гмахі, якіх ня можа скончыць.

Тутэйшая хроніка

КЛОПАТЫ АБ ПАЦЯРПЕЎШЫХ АД НЕЎРАДЖАЮ.

8 лютага адбылася ў Віленскім ваяводзкім гмаху конфэрэнцыя прадстаўнікоў ральнічых арганізацыяў з Віленскага ваяводзтва для абгаварываньня справы удзелу гэтых арганізацыяў у акцыі дапамогі насельніцтву, пацярпеўшаму ад неўраджаю. Прэзасам конфэрэнцыі быў п. Ваявода.

На конфэрэнцыі сьцверджана была цяжкая сытуацыя маларольнага і пат эбнасьць хуткае помачы. Распачалася дыскусія, у рэзультаце якой гэтак званыя „гаспадарчыя сфэры" правялі свой праэкт — збору дабрахотных ахвяраў для церпячых голад. З гэтаю мэтаю будзе арганізаваны „Камітэт Помачы насяленьню пацярпеўшаму ад неўраджаю.

Гэткім чынам увесь шум каля аказаньня помачы галадаючым зьвёўся... да збору дабрахотных ахвяраў. Трэба пажадаць пасьпеху Камітэту, які яшчэ пакуль не атварыўся. Але невядома, ці прынясе ён рэальную карысьць.

Калі у Італіі нядаўна здарыўся выбух вулькану, прычыніўшы шмат шкоды бліжэйшаму насельніцтву і пачаўся збор дабрахотных ахвяраў для пацярпеўшых, дык Муаліні забараніў на‘т гэтую акцыю, матывуючы, што пацярпеўшыя не жабракі. Калі яны раўнапраўныя грамадзяне, плаціўшыя падаткі, дык маюць права на ўрадавае падтрыманьне.

У нас бюджэт на 1929—30 г. прадбачыць надвышку даходаў над расходамі каля 130 міл. зл. Здаецца, можна было-б з гэтага ахвяраваць штось для ахвяраў стыхійных няшчасьцяў.

ТОЛЬКІ ДВА ТЫДНІ ДЛЯ СЬЦВЕРДЖАНЬНЯ ПАДДАНСТВА. Адміністрацыйныя ўлады зрабілі загад, каб фармальнасьці сьцверджэньня падданства старастамі вывыконваліся у працягу двух тыдняў. Пры сьцверджаньні грамадзянства вымагаюцца выпіскі з становых кнігаў сталага насельніцтва.

ЗАУСЁДНАЯ БРАХНЯ „ДЗ. ВІЛЕНСК. Ёсьць у Вільні эндэцкая польская газэта „Дзеньнік Віленьскі", якая вырозьніваецца тым, што калі піша што-небудзь аб беларусах, дык ня можа абыйсьціся без таго, каб не апаскудзіць іх. На‘т калі хто зводзіць свае асабістыя парахункі з кім-небудзь з беларускіх дзеячоў, ці наагул хоча скампрамітаваць беларускі рух, дык шпальты „Дз. Віл." заўсёды да іх услугаў. Няма такога бруду, ілжы і інсынуацыі проці беларусаў, якіх бы ахвотна ня зьмесьціў на сваіх старонках гэты беларусаедзкі орган ,віленскіх энэдэкаў, які першы знайшоў у праграме Хр. Бел. Дэм. „камунізм" і да гэтае пары вядзе проці яе барацьбу.

Праўду трэба сказаць, што ніхто не зьвяртае і увагі на сталую брахню „Дзен. Віленск." на беларусаў. Ды й мы не з вярнулі-б увагі, калі-б у даным выпадку пытаньне не датыкалася тых асобаў, якіх тут няма.

Вось адна з гэткіх красачак. У нумары 36, падаючы вестку аб тым, што ў Менску стварыўся „хаўрус беларусаў з Вільні„, піша: „Да ўраду хаўрусу выбраны: быўшы лаўнік магістрату м. Вільні ў часе літоўскае акупацыі ў 1920 г., роўным чынам старшыня Віленскага Саюзу Каапэратываў Чыжэўскі (абакраў каапэратыўны саюз у верасьні 1921 году і затым уцёк у Менск), сябра Ураду Віленскага Саюзу Каапэратываў (Малая Пагулянка, 12) Смоліч (абакраў каапэратыў і уцёк ў Менск... і г. д.

Калі цяпер гэтыя асобы знаходзяцца за кардонам і ня могуць нічым рэагаваць на гэткія абвінавачаньні, дык усё можна пісаць пра паасобных беларусаў, выехаўшых па тым ці іншым матывам у Менск, каб скампрамітаваць усіх беларусаў.

Калі „Дз. Віленскі" у свой час падобную брахню пісаў пра сваіх (фундуш безрабоцьця, касу хворых і іншых), дык рэдактар яе добра ведае, чым гэта канчалася.

А пра беларусаў... што-ж валяй! Тым балей, што гэтых асобаў тут няма.

ДЗЕ КОРАТКА, ТАМ і РВЕЦЦА. Паводле польскіх газэтаў, чэхаславацкі ўрад спыніў субсыдыі для расейскіх і беларускіх студэнтаў. У зьвязку з гэтым чакаюць павароту да Польшчы каля 100 беларусаў, пазбаўленых магчымасьці прадаўжаць за граніцаю вышэйшую адукацыю дзеля адсутнасьці ма тэр'яльных сродкаў.

ПЕРАГЛЯД СПРАВЫ ГРАМАДЫ. У канцы бягучага месяца распачнецца ў Апэляцыйным Судзе перагляд працэсу Грамады. Справа будзе разглядацца некалькі дзён. У склад суда уваходзяць: Старшыня — віцэ-старшыня Апэляцыйнага Суда п. Дмахоўскі, і судзьдзі—Юндзілл (дакладчык) і Бондцікевіч. Абвінавачываць будзе падпракуратар Парчэўскі і Коркуць.

Прысутнасьць на судзе абвінавачаных неабавязкава, дзеля таго, што яны параскіданы па розных вастрогах і дастаўка іх зьвязана з вялікім цяжарам. Але яны маюць права прасіць суд аб дазволе на прыезд на свой кошт. Да гэтае пары вызвана 30 сьведкаў.

ПАСЕДЖАНЬНЕ РАДЫ БЕЛАРУСКАГА ІНСТЫТУТУ ГАСПАДАРКІ і КУЛЬТУРЫ адбылося ў нядзелю 3 лютага сёл. г. у Вільні. На парадку дня былі справы: 1) справаздача ўраду з дзейнасьці за мінулы 1928 год, 2) арганізацыйныя справы, 3) перавыбары Цэнтральнага Ураду і Рэвізыйнай Камісіі.

Прыняўшы да ведама справаздачу ўраду і абгаварыўшы справы арганізацыйныя, Рада Бел. Інст. Гасп. і Культ. выбрала новы цэнтральны ўрад, у склад якога ўвайшлі наступныя асобы: кс. В. Гадлеўскі, як старшы-

ня Ураду Інстытуту, пасол А. Стэповіч і інж. Ад. Клімовіч, як віцэ-старшыні, рэд. Я. Пазьняк — скарбнік, грам. С. Сьвістун—сэкрэтар, пасол П. Каруза і грам. Я. Васілеўскі—сябры Ураду. Заступнікамі сяброў Ураду выбраны: сэнатар В. Рагуля і др. Бр. Туронак. У Рэвізыйную Камісію выбраны: кс. Адам Станкевіч, пасол Ф. Ярэміч, грам. Э. Будзька і сэнатар В. Багдановіч.

ВЫДАЛЕНЬНЕ II ВУЧНЯЎ з Радашкаўскае пачаткавай штолы. Польскія газэты паведамляюць, што па загаду Віленскага Школьнага Куратара звольнена з Радашкаўскае беларускае пачаткавае школы II вучняў нібы за тое, што іх гады перавысілі школьны век.

ЗАКРЫЦЬЦЁ ГУРТКОЎ Т-ва БЕЛ. ШКОЛЫ. Польскія газ. паведамляюць, што ў выніку зробленае рэвізіі, якая быццам уяўніла вялікія недакладнасьці у рахунковасьці мяйсцовага Т-ва Бел. Школы, адміністрацыйныя ўлады змушаны былі спыніць чыннасьць гэтага Т-ва на абшары Слонімскага павету. Пры гэтым указываецца яшчэ і на іншыя прычыны, як належаньне да Т-ва зусім няпісьменных сяброў, змусіўшых улады зрабіць гэты крок.

Нядаўна, як ведама, быў закрыты уладамі гурток Т-ва Бел. Школы у Наваградку з прычыны недакладнасьці у рахунковасьці.

САХА. Выйшаў першы нумар з 1929 г. сельска-гаспадарскае часопісі „Саха".

„САМАЎРАД ВЯСКОВЫХ ГМІН". Вышла з друку брашурка „Самаўрад вясковых гмін" І. Пазьняка. Зьмест брашуркі: Праўная дзейнасьць сучаснага самаўраду. Брашурка можа быць карысная для гмінных радных. Прадаецца у кнігарні „Пагоня", Вільня, Завальная 7, цана 20 гр.

НОВЫЯ КНІЖКІ. Выйшлі з друку: „Сірата" сцэнічны абразок у аднэй дзеі, Ю. Ігарэва, пераклад З. Верас. Цана 20 гр. „Ад чаго зло на сьвеце і другія апавяданьні". Л. Талстой, пераклаў У. Ініцкі. 24 стар., цана 30 гр., выданьне У. Знамяроўскага. Купіць можна ўва ўсіх беларускіх кнігарнях, як у Вільні, так і на правінцыі.

Аб эміграцыі.

Пытаньне аб эміграцыі у Польшчы зьяўляецца аднэю з найпаважнейшых праблемаў. Гадавы узрост насельніцтва у цэлай Польшчы дасягае 450,000 асобаў, з якіх 70 прац., ці 315,000 прыходзіцца на вёску. Але не узрастае у гэткай ступені прамысловасьць у краю якая дала-б заробак новапрыбываючым істотам. Дзеля гэтага эміграцыя, ці выезд у чужыя краі на заработак, зьяўляецца пакуль адзіным ратункам проці узросту насельніцтва ў Польшчы.

Паводле статыстычных даных, ад 1919 г. да 31 сакавіка 1928 г. эмігравала з Польшчы 945,603, з якіх да Эўропэйскіх дзяржаваў (Нямеччына, Францыя і інш.)) 467,163 чал. і пазаэўропэйскіх—478,440 чал. Сярэднім цяпер выяжджае з краю каля 132,000 чалавек у год.

У гэтым кароткім артыкуле мы ня будзем затрымлівацца над тым, як змагацца з узростам безрабоцьця у краю, як роўным чынам над тымі вымаганьнямі, якія ставяць дзяржавы пры прыйме нашых эмігрантаў, а укажам толькі на тыя інстытуцыі, дзе магчыма атрымаць патрэбныя інфармацыі, дзеля таго, што часта паступаюць да нашае рэдакцыі запытаньні, як можна выехаць да Канады, Бразыліі ці іншых краёў.

Апякуецца у нас над эміграцыяй Міністэрства Працы і грамадзкае Апекі праз падлягаючы яму „Ужонд Эміграцыйны". Эміграцыйнаму Ураду падлягаюць урады пасрэдніцтва працу (П. У. П. П.) на Віленскае ваяводзтва: Вільня, вул. Субач; паветы — Вільня-Трокі, Ашмяна, Сьвянцяны, Браслаў, Дзісна, Вялейка, Маладэчна, Паставы.

Наваградзкае ваяводзтва: Баранавічы, вул. Шосова 9, тэл. 70, паветы—Баранавічы, Слонім, Несьвіж, Стоўбцы. Аддзяленьне — Наваградак, урад ваяводзкі, паветы — Нвваградзкі, Лідзкі, Валожынскі.

Ваяводзтва Беластоцкае: Беласток, вул. Ліповая, тэл. 268; пав. — Беласток, Бельск, Падляскі, Остролэнка, Ломжа, Кольно, Выс. Мазовецк. Аддзяленьне: Горадня, вул. Ожэшковай 3, тэл. 197; пав. — Горадня, Сокулка, Сувалкі, Аўгустоў, Ваўкавыск.

Ваяводзтва Палескае: Брэст на Бугу, вул. Кшыва 6, тэл. 117; пав.—Брэст на Бугу, Дрогічын, Камень-Катырскі, Кобрын, Косаў, Лунінец, Пінск, Пружаны, Сарны, Столін.

У гэтых Урадах Пасрэдніцтва Працы можна арымаць усе інфармацыі адносна выезду да тае ці іншае дзяржавы.

З указанымі інстытуцыямі супрацоўнічае і знаходзіцца у кантакце „Польске Товажыство Эміграцыйнэ" (Варшава, Алее Ерозолімске, 33), якое выдае спэцыяльную часопісь, пасьвечаную эміграцыйным справам,— „Выходзьца" і удзяляе ўсялякія інфармацыі.

Эміграцыйны Урад выдае „Бюлетын Ужэнду Эміграцыйнэго в справе эміграцыі і осадніцтва". Хто цікавіцца справамі эміграцыі, рынкамі працы у краю, асадніцтвам і г.д., можа знайсьці у гэтых двух выдаўніцтвах усе патрэбныя інфармацыі і парады.

Кожны, хто мае намер выехаць заграніцу на працу, павінен безварункова высьцерагацца усялякіх пасрэднікаў і агентаў, ці пры атрыманьні патрэбных на выезд дакумэнтаў, ці пры куплі параходных картаў, сярод якіх ёсьць шмат звычайных жулікаў, якія займаюцца ашуканствам латваверных людзей. За усімі інфармацыямі і парадамі на-

лежыць зьвяртацца да Ураду Эміграцыйнага у Варшаве, вул. Каралеўская 33, да Ураду Пасрэдніцтва Працы, да Польскага Эміграцыйнага Т-ва у Варшаве і па справам пашпартаў да старастаў.

Урад Эміграцыйны выдае спэцыяльныя брашуркі з указаньнем, куды можна эміграваць, на якіх варунках і якія дзе варункі працы ці асадніцтва, коштаў праезду, патрэбных дакумэнтаў і пашпартавых фармальнасьцяў.

Польская эміграцыя скіроўваецца галоўным чынам да Канады, Бразыліі, Аргэнтыны, Злучаных Штатаў, Нямеччыны і Францыі. Польскімі эмігрантамі за граніцаю апякуюцца польскія консулы у адносных краёх.

АРЫШТ 13 РАДНЫХ.

Украінская газэта „Громадськiй Голос" (нумар 6) піша, што у Волі Якубовай Драгабыцкага пав. арыштавана 13 радных. Справа гэта прадстаўляецца так: у часе выбараў да Грамадзкае Рады змагаліся два кірункі: адзін кірунак Укр. Сацыял.-Радык. Партыі, дэвізам якой было, „каб грамадзкім дабром чэсна кіравала „Грамадзкая Рада", другі з дэвізам „хай ўсё гіне, абы нам было добра". Да гэтата апошняга належаў і заступнік старшыні павятовага камітэту Укр. Нар. Дэм. Аб'яднаньня пісар Сьцяпан Куленяк. Спачатку на выбарах перамаглі першыя, але другія дабіліся перавыбараў і атрымалі большасьць мейсц—17 проці 15. Гэтай большасьцю выбралі новага войта, Базыля Мельніка, які з новым годам пераняў урадаваньне і завёў у чыста украінскай грамадзе ўрадаваньне у польскай мове, нават ужываючы яе ў зносінах з чытэльнямі „Просьвіты".

25 мінулага месяца меншасьць радных (15) рашыла дамагацца ўрадаваньня ў Радзе ў украінскай мове, а гэтак сама і адчыненьня украінскае школы, дык тады большасьць (17) выйшла і перарвала паседжаньне. У наступную нядзелю прадстаўнік меншасьці ў Гр. Радзе т. Матчак заявіў сабраньню Грамады, што меншасьць Гр. Рады рашыла пастаяць у барацьбе за украінскія правы, за украінскую мову і укр. школу... У наступны дзень, раніцай, войт аказаўся ў Драгабычы, а ў ваўторак вечарам прыехала у вёску 35 паліцыянтаў і арыштавала 13 радных.

СТАТЫСТЫКА.

Нішто так не калечаць у Польшчы, як статыстыку аб нацыянальных меншасьцях, калі трэба паказаць заграніцы больш палякаў у Польшчы, чым ёсьць узапраўды. Асабліва гэта лёгка рабіць з беларусамі, частка з якіх ёсьць каталікі і шмат якіх пры выдаваньні новых пашпартоў ці пярэпісі на пытаньні, якой яны нацыянальнасьці, называлі сябе проста „тутэйшымі". А польскія статысты залічаюць усіх беларусаў-каталікоў і „тутэйшых" да палякаў.

Вось для прыкладу возьмем два польскія календары-кніжкі ральнічыя: „Календаж Рольніка Польскего" на 1929 г. (944 старонкі—цана 3 зл.) і „Календаж Господарскі" на 1929 г. (576 ст. цана 2 зл. 50 гр.). Кніжкі вельмі паважныя і карысныя для кожнага земляроба. Дзеля гэтага прапануем, што можна ахвяраваць 2,50—3 зл. і набыць адну з іх. Паміж рознымі гаспадарскімі артыкуламі і статыстычнымі данымі, у іх ёсьць і статыстыка нацыянальных меншасьцяў у Польшчы. На 30 мільёнаў насяленьня у Польшчы паводле „Кал. Гаспад." беларусаў у Польшчы ёсьць 1,460,000 (5,13 прац.), а паводле „Календажа Рольніка Польскего" — беларусаў у Польшчы толькі 1,060,737 (3,9 прац.). А 400,000, ці каля 1,5 прац. усяго насяленьня, ужо дзесь згінулі.

Дык узьнікае пытаньне, колькі-ж узапраўды ёсьць беларусаў у Польшчы? Няўжо-ж польская статыстыка ня можа даць выразнага адказу на гэтае пытаньне? Бо калі лгаць, дык трэба было хоць умовіцца. Інакш, пры гэткіх розніцах у паважных крыніцах ня можа быць даверу да ніякае з іх.

ооооооооооо

КОЛЬКІ ПРАЦУЮЧЫХ у ПОЛЬШЧЫ.

Паводле апошніх статыстычных даных у Польшчы на агульны лік каля 30 міл. насяленьня працуючых прыходзіцца 13,917,000, з іх 7,733,247 мужчынаў і 6,183.813 жанчын.

Найбольш працуе між 20 і 26 гадоў жыцьця — каля 3,5 мільёнаў, затым між 14 і 19 гадоў — 3 міл., між 30 і 39 г. — 2,5 м. У гэтым параўнаньні кідаецца ў вочы вельмі вялікі лік працуючых між 14 і 19 г. жыцьця. Калі да гэтага далічыць, што ніжэй 14 г., а значыць у дзіцячым веку, працуе ў Польшчы больш 0,5 мільёнаў, дык пераканаемся, што першае мейсца па ліку займае група дзяцей і падрастаючае моладзі, змушанае працаваць. Гэтак сама шмат працуе і нават больш 60 г.—каля 1,200,000.

Адносна фаху з 14 м. каля 10 міл. працуе ў земляробстве, агародніцтве, жывёлагадоўлі, рыбалоўстве і лясьніцтве. На другім мейсцы стаіць група займаючаяся гандлем—400 тыс. чал.

Трэцяя група—горная наагул прамысмовасьць. Прамысловасьць адзежная і галянтэрыйная — 333 тыс., дамовая абслуга—250 тысяч.

Чыгунка і меставыя трамваі даюць працу 175 тыс. асоб, прамысловасьць спартовая — 150, дзеравяная прамысловасьць 115 тыс. і будаўляная — 105 т.

Служба публічная і вольны фах—адміністрацыя, адвакатура і г. д.—каля 136 т. Навука, літэратура, штука, тэатр, музыка, спорт — каля 12 тыс.

З 14 міл. самастойных працаўнікоў каля

3 міл., а рэшта памагае ў сямействе — каля 6 міл., з якіх каля 4 міл. жанчын.

Асобаў, якія не працуюць, а чэрпаюць сродкі на утрыманьне сябе з розных даходаў (дармаедаў) ёсьць каля 25о тыс.

Адсюль відаць, што у Польшчы вельмі шмат працуе жанчын і дзяцей, на якіх ляжыць утрыманьне сямейства, а затым пажылых асобаў за 6о г., якім ужо час адпачываць.

ооооооооооо

УКРАІНСКАЯ ПРЭСА ў ПОЛЬШЧЫ.

Львоўская украінская часопіс „Діло" падае статыстыку ўкраінскае прэсы у Польшчы за 1928 год. Паводле гэтае статыстыкі, у Польшчы выходзіць 100 украінскіх часопісяў, з якіх 85 прыходзіцца на Усх. Галіцыю, 4 на Валынскае ваяводзтва, 2 на Холмшчыну і 9 на іншыя ваяводзтвы. Акрамя таго, выходзяць 4 часопісі утраквістычныя: 1 польска-украінская на Валыні, 1 польска-расейска-украінская на Валыні, 1 польска-расейска-украінская ў Варшаве, 2 расейска-украінскія ва Львове і 1 ў расейскай мове.

З гэтых часопісяў толькі адна выходзіць кожны дзень, а дзьве—тры разы ў тыдзень і 1—два разы ў тыдзень.

Затым выходзіць 26 тыднёвікаў, 14 двутыднявікаў, 33 месячнікаў, 7 трымесячнікаў і 16 пэрыядычных. Найбольш (67) выходзіць у Львове, 6—у Кракаве, 6—у Каламыі, 4 у Станіслававе, 3—у Тарнаполі, 2—у Перамышлю, 2—у Жулкві, 1—у Рогаціне, 1—у Калішы. Гэткім чынам, прыходзіцца 1 часопісь на 70,000 украінцаў.

Якімі беднымі выглядаюць беларусы са сваімі некалькімі часопісямі у параўнаньні з украінцамі.

ооооооооооооооооооооооо

Навука і тэхніка.

НАВІНЫ З ГАЛІНЫ АВІАЦЫІ.

З пералётам праз Атлянтыцкі акіян на аэрапланах цяпер скіравана асаблівая увага на будову вялізарных пасажырскіх аэрапланаў. У гэтай галіне на першым мейсцы стаіць Нямеччына, якой забаронена Вэрсальскім трактатам будаваць ваенныя аэрапляны. Але мусіць яны пераканаваны, што на выпадак вайны можна будзе лёгка прыстасаваць гэтыя паветраныя пасажырскія волаты для ваенных мэтаў — газавае вайны. Дзеля гэтага яны з такім запалам і будуюць пасажырскія аэрапляны.

Нямецкае Т-ва Рорбах С° будуе сэрыю вялізарных аэрапланаў з некалькімі сільнікамі па 600 конскіх сілаў кожны. Усе гэтыя аэрапляны празначаюцца для паветранае пасажырскае камунікацыі між Нямэччынаю і Аргэнтынаю ў Паўдзённай Амэрыцы. Гэта будуць найбольшыя з істнуючых дагэтуль аэрапланаў.

А вось фабрыка Дорнер у Швайцарыі хоча пабіць рэкорд у гэтай галіне. Быццам, прыступіла да будовы аэрапляну, крыльлі якога дўжыні 400 мэтраў (каля 600 крокаў). з 12 маторамі па 5оо конск. сілаў кожны,

Сам апарат будзе важыць 2о тонаў (12оо пудоў). Груз. г. ё. бэнзына, тлушч, абслуга, пасажыры і багаж абрахаваны на 3о тонаў. Максымальная хуткасьць лёту 3оо кілямэтраў у гадзіну. Можна трымацца ў паветры 2о гадзін. 9 матором могуць рушыць апарат, а 4 на выпадак сапсуцьця якіх-небудзь з іх.

Гандола 62 мэтраў даўжыні, а у шырыню такая, што можна зьмясьціцца 6 крэслаў з праходам пасярэдзіне. Для 6о пасажыраў будзе да ўжытку 4 кабінэты. На аэрапляне будзе месьціцца кухня, покой для абслугі, сталовая і г. д.

Калі гэта ня байка, дык хутка пачуем аб пробных палётах гэтага паветранага палацу. Хаця у гэтым няма нічога фантастычнага.

Рэдактар-Выдавец Т. ВЕРНІКОЎСКІ. ЛІТАРАМІ У. ЗНАМЯРОЎСКАГА, ФІЛЯРЭЦКАЯ 12.

ДРУК „РАХ", ВУЛ. СЬВ. ІГНАТА 5.